# РАЗДЕЛ 1
# ИСТОРИЧЕСКИЕ, ФИЛОСОФСКИЕ НАУКИ, ЯЗЫКОЗНАНИЕ

## 1.1 Социально-гуманитарные дисциплины

УДК [001(09)](476)

## НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ А. С. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

***Субоцін А. А., к.г.н.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца навуковы шлях ураджэнца Віцебшчыны А. С. Бялыніцкага-Бірулі, які ў сваім маёнтку Новае Каралёва арганізаваў дзейнасць метэастанцыі. Адзначаная метэастанцыя была вядома не толькі ў межах Беларусі, але і па ўсёй Расійскай імперыі. Назіранні А. С. Бялыніцкага-Бірулі змяшчаюць у сябе фундаментальную інфармацыю пра асаблівасці клімату другой паловы XIX – пачатку XX стст.*

Ключавыя словы: метэаралогія, гісторыя навукі, назіранні за надвор’ем, клімат, Галоўная геафізічная абсерваторыя.

Бялыніцкі-Біруля Андрэй Сімпліцыянавіч – беларускі метэаролаг, арганізатар метэастанцыі Новае Каралёва пад Віцебскам, якая дзейнічала з 1864 г. па 1941 г.

Нарадзіўся 22 жніўня 1825 г. у маёнтку Бабкі Аршанскага павета Магілёўскай губерні. Бацька Андрэя – Сімпліцыян Бялыніцкі-Біруля быў вайскоўцам, прымаў удзел у марскіх бітвах пад камандаваннем адмірала Фёдара Фёдаравіча Ушакова, ваяваў у шэрагах рускіх войскаў супраць войска Напалеона. Першапачатковую адукацыю сын Андрэй атрымаў дома, потым вучыўся ў III-й Санкт-Пецярбургскай гімназіі. У 1845 г. А. С. Бялыніцкі-Біруля паступіў на натуральнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1849 г. за кандыдацкае сачыненне па геалогіі атрымаў сярэбраны медаль.

Пасля заканчэння вучобы стаў членам Віцебскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, а з 1863 г. абраны членам Віцебскага статыстычнага камітэта. Спрабаваў займацца асветай сялян, адкрыў для іх школу. Пасля выхаду ў 1861 г. «Палажэння» аб выхадзе сялян з прыгоннай залежнасці адным з першых падрыхтаваў устаўную грамату для надзялення сялян яго маёнтка зямлёй. Да паўстання 1863 г. не далучыўся, хоць удзельнікам паўстання спачуваў.

Яшчэ ў 1853 г. Андрэй Сімпліцыянавіч атрымаў у спадчыну пасля смерці дзядзькі маёнтак Новае Каралёва Віцебскага павета. Маёнтак размяшчаўся за 18 вёрст ад горада на Смаленскай шашы, быў невялікім па памерах, паводле звестак за 1887 г. зямлі тут налічвалася 507 дзесяцін. Але займацца толькі сельскай гаспадаркай адукаванаму маладому памешчыку было сумна. Ён любіў музіцыраваць на флейце, займаўся хімічнымі вопытамі, набыў метэаралагічныя інструменты і са студзеня 1864 г. пачаў праводзіць рэгулярныя назіранні за тэмпературай і ціскам паветра. Метэапляцоўка была абсталявана за 25 метраў на поўдзень ад сядзібы, ад якой аддзялялася фруктовым садам. Назіранні праводзіліся па інструкцыі А. Купфера 1857 г. у тры тэрміны – у 7, 14 і 21 гадзіну. Па той прычыне, што ўзімку памешчык з’яжджаў у горад, назіранні праводзіліся ў Новым Каралёве толькі ў летні час, узімку прыборы перавозіліся ў Віцебск [2, с. 174].

Калі па тэрміновым указанні Міністэрства унутраных спраў у Віцебску трэба было арганізаваць правядзенне метэаралагічных назіранняў, то віцебскі грамадзянскі губернатар звярнуўся па дапамогу да Бялыніцкага-Бірулі. І той з 17 верасня 1865 г. пачаў у Новым Каралёве рыхтаваць табліцы патрэбных метэаралагічных звестак і штотыдзень перасылаў іх праз Ярэміцкую паштовую станцыю ў Віцебск. Тут яны друкаваліся ў «Витебских губернских ведомостях», а таксама перадавалася ў Дэпартамент Міністэрства унутраных спраў і рэдакцыю «Северной почты» у Санкт-Пецярбургу.

У наступныя гады Бялыніцкі-Біруля стаў актыўна супрацоўнічаць з Галоўнай геафізічнай абсерваторыяй (ГФА). Акадэміяй навук за шматгадовую бездакорную працу ў сферы метэаназіранняў у 1891 г. яму было прысвоена ганаровае званне карэспандэнта ГФА.

У 1894 г. Андрэй Сімпліцыянавіч пераехаў на пастаяннае месцапражыванне ў Новае Каралёва, дзе пабудаваў для станцыі павільён з вежай. З 1 ліпеня 1895 г. станцыя папоўнілася камплектам новых інструментаў, набытых Бялыніцкім-Бірулей за свой кошт. У пачатку жніўня таго ж года станцыю агледзеў інспектар з Пецярбурга – Уладзімір Хрыстафоравіч Дубінскі, які адзначыў што «як па якасці і ўстаноўкі інструментаў, так і па добрай якасці яе назіранняў станцыя павінна быць прылічана да лепшых станцый сеткі». Сам Дубінскі быў прызнаным спецыялістам у галіне магніталогіі. Таму можна меркаваць, што ў Новым Каралёве, акрамя традыцыйных метэаралагічных, праводзіліся і спецыяльныя магнітныя назіранні. 11–13 верасня 1901 г. на станцыі пабываў Сяргей Іванавіч Савінаў, вядомы расійскі спецыяліст у галіне канструявання метэаралагічных прыбораў [1, с. 237].

Назіранні на метэастанцыі звычайна праводзіў асабіста сам Бялыніцкі-Біруля, у рэдкіх выпадках яго замянялі падрыхтаваныя наменнікі. У 1898 г. яму дапамагала ў правядзенні назіранняў і работ А. К. Белашабская, у 1900 г. – Н. А. Бялецкая, у 1901 г. – А. А. Няміра, у 1903 г. – А. К. Белашабская і ў 1904 г. – Н. А. Бялецкая, у 1906 г. – Н. А. Бялецкая і Н. П. Каралёў, 1907 г. – Н. А. Бялецкая.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваецца «Справаздача метэастанцыі Новае Каралёва» за 1907 год. У ёй пазначана, што назіранні праводзіліся ў тры тэрміны. Прыведзены каардынаты станцыі: з.ш. 55°9’, у.д. 30°8’, якія былі вызначаны з дапамогай ад’юнкта ГФА Пятра Аляксандравіча Ліхача. Вышыня над узроўнем мора – 237,1 м. Апісаны метэаралагічныя характарыстыкі года. Так сярэдняя тэмпература года склала +3.14°С, зімы – -8.9°С, таўшчыня снежнага покрыва – 63 см. Станцыя атрымлівала з ГФА Летапісы ГФА, штомесячныя і штодзённыя бюлетэні ГФА, астранамічныя календары і працы Упраўлення земляробства і землеўпарадкавання.

Для вымярэння ціску выкарыстоўваліся стары барометр Краўзэ і новай сістэмы Вільда-Фуса. Акрамя ртутных барометраў быў і запасны анероід маркі Пэтц і Флор. Псіхраметрычная будка нармальнага тыпу была ўстаноўлена на ўзвышэнні ў садзе. У ёй знаходзіліся новы псіхраметр і валасной гігрометр, змешчаныя ў цынкавую клетку з вентылятарам. Тэрмометры былі ўсталяваныя на вышыні 3,4 м над зямлёю, такая вышыня прыбораў была ў той час тыпавой. На вежы павільёна на вышыні 12,5 м быў устаноўлены флюгер. Вакол дажджамеру была пабудавана васьмікутная дашчаная агароджа вышынёй 2,4 м. Сам дажджамер устаноўлены на слупе на вышыні 1,6 м.

Дзейнасць метэастанцыі пад кіраўніцтвам вопытнага метэаролага заахвочвалася не толькі з боку ГФА, але і Геаграфічнага таварыства, якое арганізавала па ўсёй Расіі сетку дажджамерных пастоў, у задачу якіх уваходзіла назіранне за ападкамі, навальніцамі, рознымі метэаралагічнымі з’явамі. У 1898 г. Імператарскае Геаграфічнае таварыства ўзнагародзіла А. С. Бялыніцкага-Бірулю сярэбраным медалём за правядзенне серыі назіранняў за расой [2, с. 175].

Бялыніцкі-Біруля быў у ліку ўдзельнікаў Другога метэаралагічнага з’езда Расіі ў 1909 г. 14 студзеня ён выступіў на пасяджэнні першай секцыі з дакладам «Выбар месца для галоўных станцый метэаралагічнай сеткі», які атрымаў высокую ацэнку вядучых метэаролагаў Расіі. Ён першым прыцягнуў увагу метэаралагічнай навукі да такой важнай тэмы, як уплыў горада на мікраклімат, правядзенне паралельных назіранняў на гарадскіх і загарадных станцыях.

У выніку параўнання шматгадовых назіранняў у Новым Каралёве і Віцебску Бялыніцкі-Біруля прыйшоў да высновы аб неабходнасці вынасу апорных метэаралагічных станцый за межы вялікіх гарадоў, каб вызначаць натуральныя параметры атмасферы, не скажоныя антрапалагічным уплывам. Гэтыя высновы былі настолькі новымі, што на з’ездзе палічылі гэтае пытанне заўчасным і адклалі яго. Будучыня паказала наколькі меў рацыю беларускі метэаролаг. Акрамя таго, ён расказаў на з’ездзе аб сваіх эксперыментах па вымярэнні тэмпературы паветра тэрмометрамі, рэзервуары якіх зафарбоўваліся ім у розныя тоны.

Як бачым, Андрэй Сімпліцыянавіч не толькі дакладна выконваў ролю назіральніка за прыроднымі з’явамі, але і валодаў дарам прадбачання заканамернасцяў падчас прыродных працэсаў. Нездарма, добра вядомы А. С. Бялыніцкага-Бірулю віцебскі гісторык А. П. Сапуноў, называў яго «адным з самых адукаваных і найразумнейшых людзей Віцебскай Беларусі».

У 1909 г. Андрэй Сімпліцыянавіч у сувязі з пажылым узростам перадаў усё абсталяванне метэастанцыі, будынак і адну дзесяціну зямлі ва ўласнасць ГФА. У 1911 г. станцыя Новае

Каралёва атрымала статут апорнай станцыі ГФА. Расійская акадэмія навук узнагародзіла ў гэтым жа годзе Бялыніцкага-Бірулю прэміяй у памеры 900 рублёў. На гэтыя сродкі быў пабудаваны дом для памочніка загадчыка метэастанцыі, летам праведзены рамонт метэастанцыі. Прыборная гаспадарка на час рамонту пераносілася. 26 ліпеня на станцыі пабываў інспектар ГФА, ураджэнец Віцебшчыны Антон Антонавіч Камінскі, які быў вялікім спецыялістам у галіне прыбораў для вызначэння ціску, ён дапамог адрамантаваць станцыйны барометр Вільда-Фуса [1, с. 238].

Памёр нястомны метэаролаг А. С. Бялыніцкі-Біруля ў лістападзе 1916 г. на 91-м годзе жыцця. Меў вялікую сям'ю – 4 сыноў і 5 дачок. Двое старэйшых дзяцей выбралі ваенны шлях. Сын Аляксей Андрэевіч Бялыніцкі-Біруля стаў вядомым рускім вучоным заолагам, прымаў удзел у палярных экспедыцыях барона Э. Толя. Чацвёрты сын – Барыс Андрэевіч атрымаў юрыдычную адукацыю, быў гарадскім суддзёй у Віцебску. У прызнанне яго духоўных заслуг быў абраны пазаштатным членам Віцебскага епархіяльнага праўлення. Быў членам Беларускага народнага саюза, што паслужыла фармальнай падставай яго растрэлу бальшавікамі ў ліку заложнікаў восенню 1918 г., нібыта ў адказ на забойства Урыцкага і раненне Леніна [2, с. 175].

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Очерки по истории гидрометеорологической службы России : в 2 т. / редкол.: А. И. Бедрицкий (председатель) [и др.]. – Санкт-Петербург : Гидрометеоиздат, 1997–1999. – Т. 1. – 1997. – 344 с.
2. Подлипский, А. Первый метеоролог Витебщины / А. Подлипский // Неман. – 1983. – № 4. – С. 174–175.


УДК 791.1 (476)

# РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОГО КИНО В 1920–1930-Е ГГ.


***Курлович П. М., студ., Субботин А. А., к.и.н.***

*Витебский государственный технологический университет,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*



Реферат. *В статье рассмотрены основные этапы зарождения и развития белорусского кинематографа. Акцентируется внимание на темах первых белорусских фильмов. Даётся краткая характеристика сюжета первых фильмов.*



Ключевые слова: Беларусь, кино, фильмы, режиссер, народ, кинематограф.


Если глаза – это зеркало души, то кинематограф – это зеркало нашей жизни. С момента его появления в Беларуси представилась возможность видеть зеркальное отображение нашей истории и культуры. В фондах Белорусского государственного архива кинофотофонодокументов хранятся многие моменты истории, которые передал кинематограф миллионам людей.

Кино было в Беларуси ещё до революции, но исключительно в виде новостной хроники о местных событиях: «Пожар в городе Минске на Полицейской улице», «Крушение поезда на станции Рудники», «Экскаватор – адская машина за Брестским вокзалом» и так далее. Съёмками занимались операторы местных кинотеатров, которых в одном только Минске было около шестидесяти. Потом кинотеатры вместе с оборудованием и материалом национализировали, и Народный комиссариат просвещения создал Управление по делам кинематографии. Оно должно было снимать белорусское кино, но никто в организации не знал, как это делать. Управление реорганизовали и создали «Белорусское пролеткино», которое с задачей тоже не справилось и тоже было закрыто [1].

В соответствии с решениями XIII съезда РКП(б) 17 декабря 1924 г. Совнарком БССР издал постановление «Об урегулировании кинодела в БССР».

В целях упорядочения кинодела в БССР СНК постановляет:

1. Организовать при НКП БССР Управление по делам кино (Белгоскино), действующее на началах хозяйственного расчёта с правами юридического лица.

2. Предоставить Управлению по делам кино монопольное право на прокат кинофильмов на всей территории БССР.